лось в сознании людей, что святой великомученик Георгий есть победитель – победитель зла в человеческой истории.

Великая Отечественная война длилась 1418 дней и ночей, погубила множество судеб, унесла десятки миллионов жизней. Общие демографические потери СССР (включающие погибшее мирное население) – 26,6 млн. человек. Война закончилась полным разгромом фашистской Германии. Разгром фашизма – результат усилий и борьбы всего советского народа. Победа в Великой Отечественной войне – это есть не только воинская победа, но победа христианского духа, христианской души, с их приматом человечности, духовности, всемирной отзывчивости.


1. *Крутов, А.* Это наша Победа / А. Крутов // Русский Дом. – 2010. – № 5. – С. 2.

2. *Ланцева, И.* Духовные корни победы / И. Ланцева // Русский Дом. – 2011. – № 6. – С. 13–14.

3. *Схиархимандрит Маслов, Иоанн.* Вклад Русской Православной Церкви в победу над фашизмом // Иоанн Маслов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://pravoslav-voin.info.


## «НА БІТВУ, БРАТЫ-БЕЛАРУСЫ!»; «К МЕСТИ, БРАТЬЯ-СЛАВЯНЕ!» Публіцыстыка Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны


***В. М. Белакурскі,***
*загадчык кафедры філасофіі,*
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт;*
***Ж. Я. Белакурская,***
*дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт;*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*


Публіцыстыка Вялікай Айчыннай вайны – адметная старонка творчай біяграфіі народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа. У яго артыкулах і выступленнях, напісаных у 1941–1945 гг., з усёй глыбінёй выявіўся грамадзянскі тэмперамент Коласа-публіцыста, патрыёта-антыфашыста, сына беларускай зямлі. У часы цяжкіх выпрабаванняў мастацкае слова Песняра з’ўлялася сілай, што абуджала свядомасць людзей, дапамагала мабілізаваць пачуцці і волю народа на барацьбу з фашысцкімі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захопнікамі. У гады вайны пяро пісьменніка было прыраўнавана да штыка салдата, баявое заклікальнае слова ўсведамлялася як бомба і сцяг. Так, у газеце «Віцебскі рабочы» партызаны, звяртаючыся да любімага пісьменніка з нагоды яго 60-годдзя, пісалі: «Вашы творы служаць для нас вострай зброяй. Яны клічуць да помсты, да барацьбы, усяляюць у сэрца кожнага партызана і партызанкі нястомную сілу, баявую рашучасць, натхняюць нас на новыя перамогі, на канчатковы разгром нямецкіх фашысцкіх прышэльцаў» («Віцебскі рабочы», 21 лістапада 1942 г.).

Публіцыстыка беларускага паэта Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны прадстаўлена такімі жанрамі, як публіцыстычныя артыкулы, прамовы на II і III Усеславянскіх мітынгах у Маскве, фельетон «Гітлер і чарадзей», якія друкаваліся ў газетах «Звязда», «Советская Белоруссия», «Літаратура і мастацтва», «Правда», «Известия», «Литературная газета», «Фрунзевец».

З 27 публічных твораў 14 напісана па-беларуску, 13 (амаль палова) – на рускай мове, што сведчыць пра іх усесаюзную адраснасць. Публіцыстычныя творы зарыентаваны на дакументальнасць адлюстравання (дакладнасць месца, часу), што ні ў якім разе не адмаўляе суб'ектыўнай ацэнкі аўтарам ваенных падзей.

З пункту гледжання зместу публіцыстыка Якуба Коласа ваеннай пары – гэта сродак выражэння аўтарскага погляду на развіццё ваенных дзеянняў, жыцця краіны ў час ваеннага ліхалецця, увогуле грамадзянскай пазіцыі пісьменніка-патрыёта.

У час вайны Якуб Колас не заставаўся ўбаку і ад надзённых праблем. Так, ім напісаны аглядныя артыкулы, прымеркаваныя да юбілейных дат (25-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з Усходняй, з нагоды 25-годдзя газеты «Фрунзевец» – органа Сярэднеазіяцкай Ваеннай акругі, – якая выдавалася ў Ташкенце, горадзе, дзе Якуб Колас знаходзіўся ў час эвакуацыі), вялікі аналітычны аглядны артыкул «Совместная борьба русского и белорусского народов против немецкой агрессии», а таксама артыкулы, прысвечаныя памяці народнага пісьменніка Беларусі Янкі Купалы, рускіх пісьменнікаў Аляксея Талстога і Уладзіміра Маякоўскага.

Неабходна адзначыць, што публіцыстыка – гэта своеасаблівы летапіс эпохі, яна асвятляе самыя важныя праблемы грамадства: палітычныя, сацыяльныя, маральна-этычныя і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усё, чым карыстаецца аўтар (лексіка, фразеалогія, вобразныя сродкі, сінтаксіс), вызначаецца сацыяльна-ацэначнымі якасцямі і магчымасцямі з пункту гледжання эфектыўнага і мэтанакіраванага ўздзеяння на чытача ці слухача. Публіцыстыка – гэта і моўнае мастацтва асобага роду, аднак яна мае прынцыповае адрозненне ад мастацкай літаратуры. Але калі аўтар публіцыстычнага артыкула – пісьменнік, то яго публіцыстычнае слова па сваім эмацыянальна-вобразным ўздзеянні набліжаецца да слова мастацкага, а пабудова ўласна артыкула падпарадкоўваецца законам пабудовы мастацкага тэксту. Такое ўзаемадзеянне публіцыстыкі і мастацкай літаратуры надзвычай выразна праяўляецца ў публіцыстычных артыкулах Якуба Коласа.

Як і творы мастацкай літаратуры, публіцыстычныя артыкулы пісьменніка маюць загалоўкі. Назвы, што даваў Якуб Колас артыкулам, з’яўляліся своеасаблівымі заклікамі-маніфестамі, у якіх аўтар ёміста выражаў сваё стаўленне да нямецкіх агрэсараў, заклікаў народ да супрацьстаяння ворагу, прадракаў захопнікам і іх прыслужнікам немінучую смерць, выказваў сваё захапленне воінамі Чырвонай Арміі і партызанамі, веру ў перамогу над лютым ворагам: «На бітву, браты-беларусы!»; «Да зброі, беларускі народ!»; «К мести, братья-славяне!»; «Набліжаецца час расплаты»; «Слава тебе, освободительница народа!»; «Чудо-богатырям Красной Армии»; «Жыві, Беларусь!» і г. д.

Публіцыстычныя артыкулы Якуба Коласа ваеннай пары – узор выкарыстання скарбаў роднай мовы: фразеалагізмаў, параўнанняў, размоўнай лексікі.

Тэмы, якія абыгрываюцца Якубам Коласам ва ўстойлівых выразах-выслоўях, найперш тычацца ваеннай праблематыкі, у тым ліку асобы Гітлера, яго прыслужнікаў, здраднікаў – з аднаго боку, і беларускага народа, воінаў Чырвонай Арміі, беларускіх партызанаў, усіх сумленных людзей – з другога. Так, Гітлер, паводле слоў Якуба Коласа, – гэта «сусветны разбойнік», «ілгун», «падманшчык», «бандзіт з цёмнай дарогі і грабіцель», «апошні вырадак прускай ваеншчыны», «нямецкая паскуда», «паросная свіння», «даўбешка», «нікчэмны фюрэр», «тупы нямецкі свінабой», «нямецкі кат», «душагуб», «бяздушны ідал на гліняных нагах» і г. д., што «зашыўся ў нару, як прусак у шчыліну», які «кідаецца ва ўсе бакі, як зацкаваны воўк», «залізвае свае раны, як пабіты сабака», і г. д., а яго прыслужнік Гебельс – «клышаногі недаростак».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нашэсце нямецкіх захопнікаў на беларускую зямлю Якуб Колас параўноўвае з «чорнай хмарай», «саранчой», «кляшчамі, што ўпіліся ў нашу зямлю», а саміх немцаў – са стадам «Ашалелых звяроў», называе іх «нямецкімі кілбаснікамі, «шалёнымі ваўкамі» і г. д. Ужывае Якуб Колас і алегарычныя выслоўі-перыфразы: «чудищи в образе человеческом», «палачи человеческой радости», «гробовщики культуры и истинной цивилизации» і інш.

Здраднікаў Якуб Колас называе такімі абразлівымі словамі, як «лізуны», «выскрабкі людской погані», «жывыя кучкі гною», «гітлераўскія падбрэхічы», «нямецкія паслугачы», «плюгавыя падбрэхічы», «моські, «нікчэмныя вошы», і г. д.

Ваенныя дзеянні Чырвонай Арміі Якуб Колас параўноўвае з «громам ваеннай навальніцы». Аўтар выкарыстоўвае і такія метафарычныя выразы, як «Чырвоная Армія жалезнай мятлой вымятае грабежніцкія орды ашалелага фашызму», «чуецца сталёвы поступ палкоў Чырвонай Арміі», «Чырвоная Армія крышыць хрыбет гітлераўскага двухногага звяр'я», і г. д.

Семантыка прыведзеных словазлучэнняў празрыстая, стэрэатыпная, «разгадваецца» аўтаматычна. Моўны змест апошніх арыентаваны пісьменнікам на імперсанальнага «адрасата» і прадвызначаны абагуленым асэнсаваннем жыццёвага досведу народа, чалавека як сацыяльнай істоты, яго дадатных ці адмоўных рыс праз прызму ўспрымання і ацэнкі аўтара. Рэзкае размежаванне станоўчага і адмоўнага, адпаведны падзел моўных сродкаў на станоўча і негатыўна ацэначныя сведчаць пра актуалізацыю катэгорыі этычнага плана – імкненне ўбачыць маральны бок вайны. Менавіта ацэнка па прынцыпе «маральна/амаральна» выходзіць на першы план у публіцыстыцы Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Семантычная дастатковасць народных выслоўяў з выразным знешнесітуацыйным зместам – з аднаго боку, а з іншага – сэнсавая абагуленасць апошніх прымушалі пісьменніка пазбаўляцца ад дэнататыўнай няпэўнасці тых ці іншых вядомых народных выказванняў. Іх канкрэтызацыі спрыяў такі аўтарскі прыём, як увядзенне ў тэкст слоў, якія ўзмацняюць адраснасць, напрыклад: «Нямецкая погань разяўляе сваю пастку на наш хлеб. Частуйце ж яе так, каб яна адразу ж падавілася першым кавалкам» (параўн. фразеалагізмы: разявіць рот, падавіцца кавалкам (скарынкай) хлеба).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З'яўляючыся знакамі сітуацый, выслоўі выкарыстоўваюцца як у поўным, так і ў скарочаным, трансфармаваным, варыянце, аднак іх ацэначная канатацыя дастаткова выразная і дакладная. Вольнае аперыраванне гатовым, ужо стылізаваным моўным матэрыялам дае магчымасць пісьменніку як бы пераасэнсаваць яго нанава: «Калі ў вашы рукі пападзецца здраднік, нямецкі паслугач, не шукайце асіны, а вешайце яго на першым жа дрэве».

Нярэдка Якуб Колас выкарыстоўвае толькі агульны сэнс крылатага выслоўя, на якім будуецца кантэкст. Узорам такога прыёму служыць трансфармацыя вядомых слоў Кандрата Крапівы, што сталі ключавымі ў вобразнай характарыстыцы цемрашалаў: «Дарэмна ішакі з прарэзлівымі галасамі тужыліся засланіць сонца сваім доўгім вухам».

Народныя выслоўі ўжываюцца Коласам не толькі для ацэнкі людзей, з'яў ці сітуацый, але і з інфармацыйнаю мэтаю. У такім выпадку яны спрыяюць канкрэтызацыі той ці іншай інфармацыі («Чырвоная Армія жалезнай мятлою вымятае грабежніцкія орды ашалелага фашызму»). Такім чынам, выслоўі ў публіцыстычных творах, як і ўвогуле ў мастацкіх, выконваюць у тэксце функцыі прадпісання, канстатуючы сітуацыю як «уваход» і прагназуючы на гэтай аснове «выхад», г. зн. дадатныя ці адмоўныя эмоцыі і ацэнкі. У гэтай сувязі коласаўскія выслоўі публіцыстычных тэкстаў маюць зададзеную ацэначную канатацыю, прадвызначаную мэтаўстаноўкамі аўтара, яго грамадзянскай пазіцыяй, верай у перамогу: «Няма на свеце такіх крэпасцей, якіх не скрышыла б крэпасць свабодалюбівага народнага духу». Такія выказванні набываюць характар сілагізмаў, што служаць жыццёвымі правіламі з сінтэзуючым сэнсам.

Багацце моўнага матэрыялу, дасціпнасць і дарэчнасць ужывання, афарыстычнасць і структурная лаканічнасць разам з народна-гутарковай формай яго выражэння спрыялі таму, што публіцыстыка Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны мела вялікае грамадскае ўздзеянне, не меншае, чым мастацкія творы пісьменніка.

---

*Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас ; рэдкал. В. Барысенка [і інш.]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1972–1978. – Т. 11. – Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы. – 1976. – 422 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ